Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Асавецкая сярэдняя школа
Мазырскага раёна”

Адкрыты дыстанцыйны культурна-асветніцкі марафон
“Час вымяраецца памяццю”

Намінацыя “Наша Спадчына”

# Інсцыніроўка народнага свята “Запрашаем на вячоркі”

Аўтар: Шкробат Галіна Васільеўна,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры

аг. Асавец, 2022

**Мэта мерапрыемства:**
- фарміраванне ў вучняў цікавасці і любові да гісторыі нашых продкаў, да побыту і культуры, да беларускіх народных традыцый;
- выхаванне эстэтычнага густу, творчага падыходу, ініцыятыўнасці, любові да роднага слова;
- развіццё таленту ў вучняў, далучэнне іх да культурнай спадчыны свайго народа.

**Ход мерапрыемства**

(Сцэна прыбрана пад інтэр'ер хаты.З аднаго боку стаяць стол, лава, а з другога боку - печ. Пры печы стаяць вілкі, качарга, чапяла. У хаце ёсць калаўрот, прасніца, кросны. Чуць далей за печ знаходзіцца ложак. На ім ляжаць вышываныя падушкі.

*З'яўляюцца на сцэне вядучыя свята.*
**Вядучы 1.** Сёння ў нашай хаце свята!
І гасцей як тут багата!
Усіх на свята запрашаем
І сардэчна вас вітаем.
І дарослых, і дзяцей,
І шаноўных усіх гасцей.
**Вядучы 2.** І як кажуць нашы людзі:
Хай вам даспадобы будуць
Жарты, песні, смех.
Бо без песні, хоць ты трэсні!
Без гармоніка і дуды
Ходзяць ногі не туды.
**Вядучы 3.** Шанаванне добрым людзям,
Хай вам радасці прыбудзе!
Хлопцы, дзеўкі, мамы, таты
Запрашаем вас на свята.

**Пачынаецца свята.**

*На сцэне гаспадыня Ганна і яе дачка Марыська. Марыська сядзіць на ложку і вышывае, а маці пазірае ў акно і спявае:*

Каля грэблі шумяць вербы,
Што я пасадзіла.
Няма майго міленькага,
Што я палюбіла.

**Марыська:.**Што гэта ты, маці, такую сумную песню заспявала?

**Маці:** Ды вось бацькі штось доўга няма. Загуляўся мабыць на кірмашы. *(Чуецца голас Сцяпана. Ён уваходзіць у хату)*
**Ганна**: І дзе ты, чорт стары, завалэдзіўся. Усе вочы праглядзела.
**Сцяпан:** Ой, каханенькая, мая родненькая, не крычы. Сустрэў я на кірмашы свайго сябрука, нашага земляка. Каб ты пачула, як ён іграе на гармоніку ды спявае! Сабраліся каля яго жанчыны ды хлопцы. Сапраўднае свята было. І я быў у скокі пусціўся.
**Ганна:** Хіба ж я адправіла цябе на кірмаш у скокі гуляць? Прасіла ж , каб купіў парсючка ды патаўсцей.
**Сцяпан:** Ой, жонка, думаў я купіць парсючка, ды такія цэны, што аж страшна стала. Але ж я прыйшоў дамоў не з пустымі рукамі. Купіў табе, мая даражэнькая, прыгожую хустачку (Дастае з торбы і надзявае на плечы жонцы). А нашай Марысьцы туфелькі лакіраваныя, каб танцавала ў іх ды весялілася.
**Марыська надзявае туфелькі і спявае:**
Мне татулька туфелькі купіў,
Да дзяўчатак у карагодзік пусціў.
Сёння ў гэтых туфельках пайду на танцы.
**Сцяпан:** Не, мае дарагія жанчыначкі, нікуды вы не пойдзеце. Бо сёння да нас з кірмаша госцейкі прыйдуць, а разам з імі і мой сябар. Ён так прыгожа іграў, што я запрасіў іх на вячоркі да нас.
**Ганна спявае** песню “А я ў печы не паліла”.

А я ў печы не паліла
Мілы мой, міленькі.
А я есці не варыла
Голуб мой сівенькі!

**Сцяпан спявае**

То палі міла,
То вары міла,
То вары, ух-ха-ха
Чарнабровая мая!ганна

**Ганна завіхаецца** каля печы і гаворыць: “Трэба ж нешта гатаваць, каб гасцей пачаставаць”. Марыська дапамагае маці, накрывае стол.
**Сцяпан** улёгся на ложку і кажа: “Трошкі адпачну, бо ногі гудзяць”. Ляжыць і мармыча пад нос нейкую песню.
**Ганна:** Сцяпан, ты што здурэў. Гасцей пазваў, а сам ляжыць. Ну што ты там , Сцяпан, расспяваўся? Гасцей запрасіў , а сам нагу за нагу закруціў.
**Сцяпан:** Чаго ты раскрычалася? Не дасць паляжаць. Спявае

Чаму ж мне не пець?
Чаму ж не гуляць?
Калі ў маёй хатачцы
Парадачак ідзе*(Чуецца стук у дзеры)*

**Ганна**: А вось ужо і госці на парозе. Пайшлі, Сцяпан, гасцей сустракаць. Сцяпан ідзе сустракаць з жонкай гасцей.

Міласці просім кожнага ў госці,
Вячоркі чакаюць гасцей,
Заходзьце хутчэй.

**Ганна:** Добры вечар, госцейкі. Калі ласка, у хату да нас просім. Заходзьце, калі ласка.

*У хату уваходзяць жанчыны ў нацыянальных беларускіх касцюмах. З імі Панас-гарманіст.*

**Першая жанчына**: Добры вечар таму, хто ў гэтым даму.
Добры вечар, суседзі! Здалёк агеньчык ваш відаць
Дазвольце ў хату завітаць.

**Марыська:** Дарагіх гасцей сустрэнем
З хлебам-соллю і вяселлем.
Да нас у хату запрашаем,
Шчырай ласкай усіх вітаем.

**Ганна:** Мы сягодня зладзім свята,
Клічам госцейкаў у хату.
Той вячорак нашых варты,
Хто сябруе з песняй, з жартам.
Госці з песнямі заходзяць у хату

**Сцяпан:** Праходзьце, дарагія госцейкі, за сталы.
Перш, чым справу распачаць,
Вас хачу пачаставаць.
Чым багаты, тым і рады.

*Госці сядаюць за стол. Гаспадары частуюць гасцей. Гучыць песня "Гуляць дык гуляць".*

**Сцяпан звяртаецца да гасцей:** Шаноўныя, госцейкі. Сёння быў на кірмашы. Ды якія ж песні чуў там. Давайце і мы заспяваем.

Госці спяваюць песню "Цячэ вада ў ярок"

**Сцяпан:** Вясёлыя песні гучаць у пакоі. І кожны з гасцей у цудоўным настроі. А давайце крыху патанцуем. Танцуюць усе.

**Трэцяя жанчыны:** А хто так прыгожа ў вас вышывае ды тчэ?

**Гаспадар:** Гэта жонка з дачкою вышывалі ды ткалі. Ужо поўны куфар ручнікоў ды посцілак надбалі. Добры пасаг будзе маёй Марысьцы. Сцяпан паказвае даматканыя ручнікі

**Ганна:** Ды і вам ёсць, што паказаць. Вунь, якія ў вас прыгожыя фартухі ды сурвэткі. Ёсць чаму павучыцца.

***Хтосьці стукае ў дзверы***
***Заходзіць кума Вольга***

**Кума:** Добры вечар, кумачкі! Я вось ішла, музыку пачула. Думаю, дай на агеньчык загляну.
**Сцяпан:** Праходзь, калі ласка, кума. ( Спявае) Раскажы мне куманька, дзе была? Што ж ты на вячоркі нам прынясла?
**Кума:** Прынесла з сабой цудоўны настрой, песні ды танцы. Давайце патанцуем. Панас зайграй нам "Падыспан". *Усе танцуюць.*
**Чацвёртая жанчына:** А давайце яшчэ патанцуем.
*Танцуюць "На рэчаньку".*
*Пасля танцаў селі за стол, заспявалі беларускую народную песню "Гуляць дык гуляць".*
**Пятая жанчына**: Вельмі добра мы гулялі,
Песні пелі і скакалі,
Але час і гонар знаць,
Заўтра ж рана ўставаць.
**Першая жанчына:** Праўда, пара нам і чэсць знаць! Час рухацца дамоў. Засядзеліся мы ў вас. Ужо нават і першыя пеўні пачнуць хутка спяваць.
**Ганна:** Дарагія госцейкі!
Ці добра ці смачна было?
Частавалі, чым маглі,
Весяліліся, як умелі,
А што кепска -то прабачце.
**Кума:** Скажам "дзякуй"
Гаспадыні з гаспадаром.
Хутка сустрэнемся мы зноў,
А цяпер пара дамоў.
**Гаспадары**: Прыходзьце, дарагія суседзі, будзем рады вас сустрэць у нашай хаце.
*Госці выходзяць за стала і па чарзе гавораць пажаданні гаспадарам.*
**Другая жанчына:** Шчыра вам жадаем
Шчасця і здароўя!
Каб было гасцей у вас
Поўнае застолле.
**Трэцяя жанчына**: Жадаем моцнага здароўя,
Шчасця, поспехаў у працы,
Кахання і радасць у сям'і
І доўга-доўга, каб жылі.
**Чацвёртая жанчына:** Хай бог дасць здароўя, надзею,
Шчасця шмат і любоўнага раю.
Няхай смутак, хвароба і беды
Абыходзяць здалёк вашу хату.
**Пятая жанчына:** Няхай вам часценька шанцуе на госці,
Ніхто , каб ніколі не меў на вас злосці.

Здаровы бывайце, нас не забывайце!
Часцей у госці запрашайце!
***Гучыць песня "Бывайце здаровы, жывіце багата"***
**Ганна**: Няхай шчасце будзе ў кожнай хаце.
Давайце жыць у міры і згодзе.  Госці танцуюць і пакідаюць сцэну